**Бахановіч Н.Л. (Мінск, Беларусь)**

# Статус лесніка ў феадальным грамадстве: кампаратыўны аспект

У цэнтры ўвагі дадзенага артыкула хрэстаматыйныя творы малой прозы канца XIX – пачатку XX ст.: “Забыццё” (1891) С. Жэромскага і “Малады дубок” (1913) Я. Коласа. Звычайна даследчыкі, аналізуючы апавяданнне беларускага пісьменніка, звяртаюць увагу на майстэрства псіхалагізму – здольнасці глыбока пагружацца ва ўнутраны свет чалавека. Увядзенне твора ў кантэкст іншых, дзе таксама раскрываецца вобраз лесніка, напрыклад, згаданага польскага аўтара, дазваляе ўбачыць спецыфіку становішча чалавека, які займае гэту пасаду, у феадальным грамадстве.

У апавяданні “Забыццё” С. Жэромскага галоўным героем з’яўляецца малады шляхціц – аўтар-апавядальнік, які расказвае выпадак са свайго палявання. У цэнтры апісанай ім гісторыі знаходзіцца ляснік, які выступае ў надзвычай паказальным з гістарычнага і сацыяльнага пункта погляду вобразе.

Аўтар з таварышам панам Альфрэдам, а таксама леснікам Лялевічам задоўга да раніцы выправіліся ў захапляльны начны лес паляваць на качак. Па дарозе яны заўважылі каня аднаго з мясцовых мужыкоў і сталі шукаць злачынцу, аглядаючы яго сціплую гаспадарскую ўласнасць: “Роспуски были маленькие, с совершенно рассохшимися спицами колес. Передок соединялся с задком одной дрогой; сквозь подушки и оси были проткнуты высокие шкворни. С правой стороны дышла стояла кляча, привязанная к валькам истрепанными постромками. Были они, верно, одних лет с лошадью. Хомут, не подшитый хомутиной, вытер ей волос на шее, деревянный чересспинник ободрал бока, старые удила разъели губы. Хомут сполз у нее с шеи на уши, так как она опустила голову и, щуря глаза с выражением неописуемой усталости, пощипывала траву. Слепни и мухи садились ей на шею, впивались в острый, как пила, хребет, кусали брюхо, лезли в глаза. Она даже не пыталась их отогнать, а если когда и взмахивала хвостом, то скорей по привычке” [1]. Гаспадар каня Абаля пазіцыянуецца праз суаднясенне са сваёй жывёлай: “Было какое-то сходство между ним и его кобылой. Низенький и худой, с землистым лицом, весь иссохший, изможденный, с необыкновенно сутулой спиной, он производил впечатление приспособления для поднятия тяжестей, чего-то вроде живого рычага…” [1]. Становіцца зразумелым, што беднасць, калі не вымусіла, то, перадусім, садзейнічала ажыццяўленню селянінам крадзяжу.

Ляснік пачаў моцна біць злачынцу, які амаль не рэагаваў на гэта, а калі адчуў пагрозу жыццю, толькі ўскрыкнуў, таму што нёс у сабе вялікую трагедыю: герой краў дошкі на труну для адзінага пятнаццацігадовага сына. З пакутай у вачах мужык прасіў прабачэння і дазволу адпрацаваць за правіннасць, аднак пан Альфрэд патрабаваў аплаты грашыма і пагражаў турмой. Пахаванне прадугледжвала і без таго вялікія траты, якіх не мог сабе дазволіць чалавек, што ўжо на працягу месяца з сынам не еў бульбы. У хляве сапраўды знаходзілася цела хлопчыка, падобнага да бацькі: “Мальчик был так же худ, как и отец, у него были такие же черные ноги с расплюснутыми пятками, только волосы были причесаны и лицо вымыто. В

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сложенных на груди, черных, как земля, руках, он держал выстроганный из палки крестик. Над ним столбом вились комары и мухи, садились на лицо, впивались в уголки губ. Обаля подошел к трупу и обмахнул его веткой, чтобы отогнать их. Когда он возвращался к нам, глаза его были мутны от слез” [1].

Ляснік, звязаны адначасова з прадстаўнікамі і прывілеяванага, і непрывілеяванага класаў, вымушаны будаваць добрыя адносіны з абодвума, што вымагае выканання некалькіх сацыяльных роляў. Застаўшыся адзін на адзін з селянінам, Лялевіч спачувае і падтрымлівае яго: “Выглянув оттуда и увидев, что пан Альфред далеко, он повернулся к Обале и быстро зашептал:

– Не бойтесь ничего, Винцентий… я его уломаю… – ничего не бойтесь… Я забегу к вам с рубанком, и мы с вами на славу выстрогаем гробик, пусть только уйдут домой эти собаки. Я забегу к вам, забегу…” [1]. Затым ляснік пачаў пераконваць пана Альфрэда, што Абалю трэба пакараць, аднак з-за беднасці турма ў дадзеным выпадку будзе для яго хутчэй выратаваннем, пасля якога той атрымае шанец канчаткова зрабіцца злодзеем.

У апавяданні “Малады дубок” (1913) Я. Коласа галоўным героем з’яўляецца селянін Андрэй Плех, учынак якога становіцца прычынай ланцуга падзей: герой украў для гаспадарскіх патрэб загадзя прыкмечанае дрэва ў лесе. Другім удзельнікам падзей выступае ляснік Максім Заруба, вобраз якога не без мэтазгоднасці раскрываецца ў творы таксама даволі поўна.

У выніку ўчыненага селянінам крадзяжу злодзеем вымушаны стаць і сам ляснік, які, каб не быць пакараным за нядобрасумленнае нясенне службы, вымушаны ліквідаваць сляды зробленай аднавяскоўцам шкоды: “«І выбера ж часіну, паганец! – зноў разважаў з сабой Максім. – Ну, каб папаў! Гужы, лейцы – усё пасек бы». Максім ніяк не мог супакоіцца. Ён выйшаў на дарогу, куды вёў след ад калёс. Але далей цяжка было разабраць, куды ён пайшоў: ці мала едуць па дарозе ва ўсе канцы? Максім пастаяў, патупаў, як бы разбіраючы важную справу. На душы ў яго было цэлае пекла. Злосць на таго, хто ссек дуб, хто, як сумыслу, як на здзек яму зрабіў гэтую пакражу, ніколечкі не клапоцячыся схаваць канцы; далей – страх перад ляснічым, страх за страту кавалка хлеба: даўно ўжо капаецца пад яго аб’ездчык, не раз пагражаў Максіму і ляснічы прагнаць яго са службы” [2, с. 208]. Ад гэтага моманту ўсе думкі Максіма сталі ісці ў кірунку, ці не заўважыў раней за яго аб’ездчык схаваны пень ад дуба.

Адважыцца на крадзеж селяніну было нялёгка, хоць гэта і не лічылася сярод сялян вялікім грахом: “У сваім жыцці Андрэй кіраваўся прыказкаю: «Не бяры чужога і не бойся нікога». Але во прыпёрла так, што прыходзілася касаваць гэты мудры кірунак. Праўда, у лесе красці не грэх. Гэта не тое, што залезці да чалавека ў хату. І хто ў лесе не злодзей, той дома не гаспадар. Лес – Божы: Бог яго росціць і Бог гадуе. А князя чорт не возьме, калі ён, Андрэй, ссячэ адзін дубок. Так разважаў вечарамі Андрэй, пыхкаючы люлькай” [2, с. 210]. Пісьменнік апраўдвае ўчынак з пазіцыі абсурднасці сітуацыі абмежавання натуральных правоў аднаго чалавека з боку іншага карыстацца дарункамі прыроды. Але герой уступае ў канфлікт з

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

грамадскімі ўяўленнямі аб бязгрэшнасці такога крадзяжу: “Андрэй узяў сякеру, хацеў перахрысціцца, ды стрымаўся: гэта справа не святая, і ён не адважыўся прызваць на помач імя Бога” [2, с. 211].

Герой працаваў у лесе ноччу, пры малым святле маладзіка, калі трывога напаўняла сабой усё наваколле, памнажаючы і пакуты сумлення чалавека. З вяртаннем дадому ён адчуў нездавальненне з нагоды магчымых наступстваў учынку, аб якім нагадвала ўсё вакол, у тым ліку і жывёла ў хляву: “Толькі адна свіння не хацела звяртаць увагі на Андрэя. Яна спакойна ляжала ў сваім берлагу і, здавалася, ніколечкі не дзівілася, як бы даўно ведаючы, што і чалавек часамі бывае не лепшы за яе” [2, с. 217]. З атрыманнем такога жаданага некалі дубка жыццё героя змянілася ў горшы бок, узнікла напружанне і ва ўзаемаадносінах з лесніком: “Цяпер Максім ні на момант не сходзіў з вачэй Андрэя. Андрэй успомніў, што яны з Максімам калісьці сябравалі, разам гадаваліся, разам былі на прызыве, у адзін год жаніліся і потым ужо разышліся не з-за якога ліха, а так проста разлучыліся, а сходзіліся – кожны з іх мог смела паказаць вочы адзін другому. І Андрэй першы раз пачуў, што нейкая сцяна вырасла ў гэтую ноч між ім і Максімам. Андрэю было чагосьці шкада. Чаго? Ён і сам не ведаў” [2, с. 215]. Не вытрымаўшы пакут, Андрэй выкінуў камлюкі Нёману як ахвяру, пусціўшы на вецер і ўласныя мазалі. Нікому не стала ад гэтага лягчэй, але сам учынак сведчыць пра глыбінную працу душы.

Пісьменнік паказвае, з аднаго боку, натуральную патрэбу селяніна ў грашах і неабходнасць эканоміць, няхай сабе і такім шляхам, з іншага – развітую маральнасць Андрэя. Я. Колас недарэмна прадстаўляе ў дадзеным творы вобразы абодвух удзельнікаў дзеяння: так ён канцэнтруе ўвагу на складанасці пабудовы адносінаў паміж сялянамі і лесніком з-за ўсталяваных сацыяльных парадкаў. У творы прысутнічае падтэкст, які датычыцца высвятлення спецыфікі гэтых узаемадачыненняў, напрыклад, Максім разважае над прычынамі ўласнага звальнення ў больш агульным ключы:

“– Тырчаў на дарозе пень, пакуль за яго не чапляліся, а сталі чапляцца – пню не ўтрымацца” [2, с. 223].

Ляснік не вельмі эмацыянальна рэагуе на ўчынак свайго колішняга сябра – не кідае жорсткіх абвінавачванняў, выслухоўвае споведзь з горкай усмешкай. Не робіць уражання на яго і рашучасць Андрэя ўпасці ў ногі ляснічаму, таму што зараз усё роўна нічога не можа змяніцца (затое, каб злавіў Андрэя ў лесе, то меў бы з ім іншы рахунак). Ляснічы без увагі рэагуе на прызнанне Андрэя, выказваючыся на тэму таго, якім бы стаў гаспадаром селянін, калі б не быў злодзеем у лесе. Пісьменнік, паказваючы супярэчлівасць і незайздроснасць пасады лесніка, выступае філосафам і жыццязнаўцам. Калі Андрэй вяртаецца ад аб’ездчыка, мудрая прырода нібы напявае: “Лес стаяў спакойны, толькі ўгары шумелі паціхеньку хваёвыя галінкі, як бы віталі першы сняжок. А можа яны шапталі што Андрэю, як шэпча маці, схіліўшыся над дзіцем, расказвалі сваёй мовай аб тым, што Андрэй сапраўды не такі вінаваты, як гэта крычыць яму кожную хвіліну чулае сумленне. Эх, лес! Колькі чаго давялося бачыць яму на сваім вяку. Многа ён ведае

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

ўсяго! І каб Андрэй расчытаў яго гутарку, то зусім бы інакш пазіраў на свет” [2, с. 225]. Аўтар развівае тэму казкай аб дзіўным клубку, ад якога былі сытыя ўсе людзі і жывёлы, пакуль гэтаму не пазайздросціў злыдзень: клубок раптоўна знік, ад чаго стала знікаць і жыццё навокал. У метафарычным вобразе клубка аўтар увасобіў жыццядайнасць самой прыроды, у прыватнасці лесу, яго прызначанасць для ўсіх.

У творах С. Жэромскага і Я. Коласа адлюстравана праблема складанасці пабудовы адносінаў паміж леснікам і сялянамі ў феадальныя часы: неадназначнасць статусу вымушае чалавека на гэтай пасадзе выконваць розныя сацыяльныя ролі ў сялянскім і панскім асяроддзях [1, с. Жэромскі); а селянін з-за сутыкнення калектыўнага і асабістага сумлення вядзе з сабой разбуральную ўнутраную барацьбу (“Малады дубок”).

Літаратура

1. Жеромский, С. Забвение / С. Жеромский // Электронная библиотека RoyalLib.com [электронный ресурс]. – Режим доступа : http://royallib.com/read/geromskiy_stefan/zabvenie.html#0. – Дата доступа : 14.05.16.

Колас, Я. Збор твораў : у 20 т. / Я. Колас. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – Т. 5 : Апавяданні (1906–1924) / [рэд. З. Драздова]. – 542 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ